# СВАБОДА

№16(31), 17 ЖНІЎНЯ 2006 г.


# КОЛАС З НАМІ

## У БЕЛАРУСІ АДЗНАЧЫЛІ 50-Ю ГАДАВІНУ З ДНЯ СМЕРЦІ БЕЛАРУСКАГА КЛАСІКА

Выдатны беларускі пісьменнік, аўтар вядомай кожнаму даросламу і школьніку паэмы «Новая зямля», шматлікіх аповесцяў і раманаў Якуб Колас памёр 13 жніўня 1956 году.

Сёлета 14 жніўня на Вайсковых могілках у Мінску ўшанаваць памяць вялікага беларускага класіка прыйшлі каля шасьцідзесяці чалавек. Сярод іх былі пераважна пісменьнікі, мастакі, журналісты. Выступілі сын Якуба Коласа Даніла Мацкевіч, народны артыст Беларусі Анатоль Жук.

Паводле злой іроніі, напярэдадні памятнай для беларускай гісторыі даты з'явілася паведамленне аб тым, што гісторыя Беларусі ў школах будзе выкладацца па-руску. Які здзек і насмешка над памяццю беларускага песняра, аднайго з найвялікшых дзеячаў нашай культуры! Зрэшты, чаго здзіўляцца, калі старэйшы творчы саюз, які ў свой час узначальваў Народны пісьменнік Беларусі Якуб Колас, нядаўна быў выселены з Дома літаратараў, а Саюз беларускіх пісьменнікаў пазбаўлены большай часткі бібліятэкі і рэшты маёмасці. Цяпер Домам літаратара цалкам валодае Адміністрацыя прэзідэнта.



**Кветкі да помніка Якуба Коласа.** *Мінск, Вайсковыя могілкі, 14 жніўня 2006 году.*

Перад тым Беларускі гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа таксама быў выкінуты ўладай на вуліцу.

Трэба прызнаць, пры жыцці пісьменнік карыстаўся ласкай улады. Ён быў узнагароджаны высокімі савецкімі ордэнамі, уганараваны Сталінскай прэміяй. Тым не менш, у народзе існуе легенда, паводле якой Якуб Колас у апошні дзень свайго жыцця наведаў Курапаты — урочышча пад Мінскам, дзе НКВД за сталінскім часам расстрэльвала мірных людзей, у тым ліку, беларускую інтэлігенцыю...

Куды насамрэч у свой апошні дзень наведаўся Якуб Колас — чытайце на

► СТАР.4

# КУБІНСКАЯ ХВАРОБА

## УРОКІ ДЫКТАТУРЫ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

► СТАР.5

# НАША ЧАРГА

## ЭСЭ СЕРЖУКА СОКАЛАВА-ВОЮША

► СТАР.6

# ЦІ СТАЛА БЕЛАРУСЬ ЗА АПОШНІЯ 15 ГАДОЎ БОЛЬШ СВАБОДНАЙ І НЕЗАЛЕЖНАЙ?

**МАРЫЯ, ШКОЛЬНІЦА, 15 ГАДОЎ:**

## «НЕ АДЧУВАЮ СЯБЕ СВАБОДНАЙ»

Я не адчуваю сябе жыхаркай свабоднай краіны. Растлумачыць гэта не так лёгка. Несвабода прысутнічае ў нашай школе, на ўроках, асабліва гісторыі. І па-за школай мы не зусім свабодныя людзі. Мы ведаем, пра што можна гаварыць, а пра што лепей памаўчаць.

**АЛЕСЬ МАРАЧКІН, МАСТАК:**

## «АДНАЗНАЧНА НЕ»

Я магу адназначна сказаць, што не. Яна не стала ні свабоднай, ні незалежнай. А прычына тут ясная. З прыходам новага ўладара грамадства падзялілася. Чаго не было ў пачатку 90-х гадоў. Калі камуністы пацярпелі крах напрыканцы 1980-х, такой атмасферы ў грамадстве не было. Лінія Сталіна пралягла праз сем'і. Лінія Сталіна падзяліла грамадства".

**ВІКТОРЫЯ, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ:**

## «УСЁ ГЭТА НЕЙКАЕ НЕСАПРАЎДНАЕ»

"Так. Фармальна Беларусь незалежная дзяржава, з усімі адпаведнымі атрыбутамі. Але ўсё гэта нейкае несапраўднае. І грошы нашыя несапраўдныя. Бо занадта шмат паперы. Невядома, ці застануцца яны пасля інтэграцыі. І войска нашае — нейкі філіял расійскай арміі. І так ва ўсім астатнім.

**МІКАЛАЙ СКАРАБАГАТАЎ, ОПЕРНЫ СПЯВАК:**

## «МЫ ЖЫВЕМ У ІНШАЙ КРАІНЕ»

"Безумоўна, Беларусь стала больш незалежнай, чым была. Бясспрэчна, мы жывем у іншай краіне. У нас свае грошы, свае межы, мытні. Усе тыя атрыбуты, якія павінна мець самстойная дзяржава, у нас ёсць. А што тычыцца свабоды, дык на гэтае пытанне не так проста адказаць. Узгадваючы Беларусь савецкую, я памятаю, як цяжка было знайсці якую гістарычную інфармацыю, нават кніжкі добрыя здабыць. Сёння любая гістарычная інфармацыя не з'ўляецца таямніцай, як калісці. Усяго 15 гадоў прайшло. Тым, чым валодалі літаральна адзінкі, цяпер шмат хто можа пры жаданні авалодаць. Ёсць Інтэрнэт. А ці з'ўляецца нашая краіна тым, да чаго мы імкнуліся — гэта ўжо іншае пытанне. Наўрад ці існуюць ў Беларусі людзі, якія б сказалі, што "мы хацелі б у такой дзяржаве жыць". А ці былі такія часы, калі людзі былі задаволеныя ўсім? Думаю, што не.

**ГЕНАДЗЬ, БІЗНЕСОВЕЦ:**

## "МЫ — НЕЗАЛЕЖНЫ КАЛГАС»

Мы — незалежны калгас. Пра свабоду я памаўчу, бо яе мы згубілі надоўга. А вось незалежнасць наша... Мы апошні кавалак эсэсэсэр. Гэткае Прыднястроўе, якое ўсе прызналі. Бо няма ў нашай краіне беларускага зместу. І нават само слова "краіна" за гэтыя гады так і не прыжылося ў масах. Як былі мы "рэспублікай", так і застаемся.

**АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ, БНФ:**

## «БУДАВАЦЬ СВАБОДНУЮ БЕЛАРУСЬ УЛАДА НЕ ДУМАЕ»

Беларусь дэ-факта з'яўляецца незалежнай краінай. Але ў той самы час яна не ёсць краінай сабоднай. Дэ-факта мы праводзім незалежную палітыку, у першую чаргу — ад нашага ўсходняга суседа. Але шмат у чым нашая палітыка супадае з тым, што наш усходні сусед хоча. Што тычыцца свабоды, дык яе недастаткова. І будаваць свабодную Бедларусь улада нават не думае. Ёй свабодная Беларусь непатрэбная. Ну а незалежнасць будзе гарантаваная толькі тады, калі тыя людзі, якія будуць пры ўладзе, будуць праводзіць такую палітыку, каб не толькі загарантаваць сабе ўладу, але для якіх незалежнасць — важкая каштоўнасць.

**АДАМ ГЛОБУС, ПІСЬМЕННІК:**

## «СВАБОДНЫХ ЛЮДЗЕЙ ПАБОЛЕЛА»

Я не ведаю, у якім кантэксце гэта будзе гучаць... Незалежная ад каго і да якой ступені? Свабодная — таксама, да якой ступені? Я свабодны. Бо ў мяне свабода ў сярэдзіне. Гэта цытата са Шнура, але я прытрымліваюся такой думкі. Я лічу,што ў Беларусі свабодных людзей, у якіх свабода ў сярэдзіне, стала значна больш. І незалежнасці за апошнія 15 гадоў таксама паболела".

**ВІТАЛЬ СУПРАНОВІЧ, ПРАДЗЮСЕР**

## «НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ» І «СВАБОДА» ЯШЧЭ НЕ ПРЫЖЫЛІСЯ

Атрыбуты незалежнасці ў нас захаваныя. І гэтыя атрыбуты досыць важкія. Многія народы такога не маюць. А вось у галовах людзей, скажам так, "незалежнасць" і "свабода" яшчэ не прыжыліся. І ўлады сябе паводзяць так, бо народ не гатовы да свабоды. Калі б гэтыя паняцці былі належным чынам успрынятыя народам, у нас была б іншая ўлада.

**ВАСІЛЬ, ПЕНСІЯНЕР:**

## «УСЯМУ СВОЙ ЧАС»

Так. Беларусь стала за гэтыя гады рэальна незалежнаю краінаю. А што тычыцца свабоды, дык 15-ці гадоў замала, каб зразумець, што гэта такое. Для гэтага павінна не адно пакаленне змяніцца. Каб зразумець, што свабода — гэта святое. Закон — гэта святое. Канстытуцыя — гэта святое. І зразумеўшы, бараніць гэта ўсё. І калі гэтага разумення няма, дык што ж вы хочаце? Гэта ўсё роўна, што сляпому растлумачыць, што такое "святло". Але ўсяму свой час. Беларусы не на выспе жывуць. Ім дапамогуць зразумець, што без свабоды будзе вельмі кепска.

# ПРАВАКАЦЫЯ СУПРАЦЬ БНФ

**16 жніўня сапёры, якіх выклікалі супрацоўнікі міліцыі Савецкага РУУС, сарвалі прыстасаванне, прымацаванае да дзвярэй управы партыі БНФ. Прыстасаванне нагадвала выбуховае.**

Высветлілася, што гэта быў муляж. Сапёры паведамілі Радыё Свабода, што ён вельмі падобны на сапраўдную міну завадской вытворчасці. Гэта цёмназялёны металічны кантэйнер. На яго днішчы намяляваная свастыка – калаварот, эмблема незарэгістраванай арганізацыі РНЕ (Рускага нацыянальнага адзінства).

Кіраўніцтва БНФ ацэньвае гэтае здарэнне як тэракт і правакацыю з боку спецслужб з мэтай запалохаць апазіцыю.

*РС*



**Рэшткі муляжа,** *знойдзенага ля дзвярэй штаб-кватэры БНФ, збіраюць супрацоўнікі міліцыі. Мінск, 16 жніўня 2006 году.*

# РНЕ ПАГРАЖАЕ

**Недзяржаўная грамадска-палітычная газета «Витебский курьер М» 10 жніўня атрымала ліст з пагрозамі ад імя арганізацыі «Русское национальное единство».**

«Финансируемая из-за рубежа американскими и немецкими врагами России ваша газетенка наносит вред единству славянских народов», - сцвярджаецца ў лісце. Яго аўтары патрабуюць ад рэдакцыі выдання на працягу месяца перагледзець сваю інфармацыйную палітыку і «прекратить публикации, дискредитирующие существующую в Беларуси власть и глубоко уважаемого нами первого президента Александра Григорьевича Лукашенко, ведь он ведет непримиримую, вселенскую борьбу за величие славянских народов с жидами и либералами всех мастей, которые стремятся поработить великий русский народ».

У адваротным выпадку выказваюцца пагрозы задзейнічаць «все свои ресурсы и связи в коридорах власти», каб максімальна хутка закрыць газету.

Тэкст ліста дапаўняе малюнак - малады мужчына ў ваеннай форме, аздобленай свастыкай, трымае ў адной руцэ падвешанага на вяроўцы чалавека, на грудзях якога намаляваная зорка Давіда, а з кішэняў сыплюцца долары, а ў другой - меч. Пад малюнкам подпіс: «Очистим Россию!».

Галоўны рэдактар газеты Уладзімір Базан паведаміў, што калектыў мае намер звярнуцца ў праваахоўныя органы з патрабаваннем выявіць і прыцягнуць да адказнасці аўтараў гэтага ліста.

18 ліпеня ананімныя пагрозы ў свой адрас атрымалі журналісты недзяржаўнай газеты «Intex-press» у Баранавічах. На зварот ў міліцыю рэдакцыя атрымала адказ, што ў ходзе пошукавых мерапрыемстваў злачынцаў выявіць не ўдалося. Таксама месяц таму падобныя пагрозы ад РНЕ атрымала старшыня віцебскай арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

**www.baj.ru**

# СТРАЙК НА ЛЕСАПУНКЦЕ

*У мястэчку Васілевічы Рэчыцкага раёна на лесапункце замежнага прадпрыемства «Еўранатурпаркет» адбыўся страйк.* Рабочыя ўчастка раскрыжоўкі лесу не прыступілі да працы. Яны патрабавалі выплаты заробку за чэрвень і ліпень.

— Калі пачаўся страйк, праз некалькі гадзін з галаўнога офіса, што знаходзіцца ў Смалявічах пад Мінскам, прыехала наша вышэйшае начальства. Людзям зноў казалі: «Вы працуйце, а грошы будуць», — кажуць рабочыя лесапункта.

Начальнік лесапункта Іван Ацута патлумачыў адсутнасць грошаў наступным чынам: «Заробак мы атрымліваем з цэнтралізаванай бухгалтэрыі, якая знаходзіцца ў Смалявічах. За чэрвень бухгалтэрыя павінна выплаціць амаль 40 мільёнаў рублёў. Ніхто не атрымаў ні рубля. Наколькі я ведаю, «Еўранатурпаркет», да якога мы належым, знаходзіцца ў стадыі санацыі. Вырашаецца пытанне наконт перадачы прадпрыемства ў рэспубліканскую ўласнасць. Усе дакументы зараз знаходзяцца ў адміністрацыі прэзідэнта».

Лесапункт у Васілевічах займаецца валкай лесу, яго апрацоўкаю і сартыроўкаю. Людзі рыхтуюць асартыменты і адпраўляюць чыгункаю ў Смалявічы. Працуе тут 135 чалавек.

**www.bulletinonline.org**

# ФУРЫ ЕДУЦЬ У АБ'ЕЗД

*На расійска-латвійскай мяжы ўтварылася чарга з грузавых фураў.*

Ейная даўжыня складае прыблізна 15 кіламетраў. Асноўная прычына зграмаджэння вялікагрузных аўтапаяздоў выкліканая пераарыентацыяй транспартных плыняў з беларуска-расійскага на латвійска-расійскі ўчастак мяжы ў сувязі з павелічэннем дарожнага падатку і ўзмацненнем транспартнага кантролю ў Беларусі. Пра гэта заявіла мытная служба Расіі. Па водгуках транспартных фірм, не зважаючы на чэргі ў пунктах пропуску, ім выгодней увозіць тавары ў Расію праз Латвію.

**«Белорусские новости»**



**Артур Фінькевіч** *(у цэнтры), які адбывае пакаранне ў Магілёўскай спецкамендатуры за надпіс палітычнага зместу, сустрэўся са сваімі паплечнікамі з Маладога Фронту. Справа — лідэр МФ Зміцер Дашкевіч. Магілёў, 12 жніўня 2006 году.*

# МІХАСЬ МІЦКЕВІЧ: «ЁН У ГЭТЫ ДЗЕНЬ ЕЗДЗІЎ У ЦК»

## Пра акалічнасці раптоўнае смерці Якуба Коласа ў 1956 годзе распавёў малодшы сын пісьменніка



**ЯКУБ КОЛАС**. *Помнік на Вайсковых могілках у Мінску.*

Спадар Міхась апошні раз бачыў бацьку 30 ліпеня 1956 году. Развітаўшыся, ён назаўтра паехаў на спартакіяду ў Маскву, адкуль мусіў вярнуцца 13 жніўня. У гэты дзень якраз спаўнялася пяць гадоў ягонай дачушцы Марыі. Таму вяртаўся ў Мінск у добрым гуморы, якому спрыяў і паспяховы выступ на той спартакіядзе. Сам сабе яшчэ падумаў, што, відаць, да нечага нярадаснага ягоная весялосць у цягніку. На мінскім пероне стала ясна, што прадчуванне не падманула.

Успамінае Міхась Міцкевіч: "Калі я толькі выйшаў на перон, мяне сустрэла жонка з нашым сябрам Сяргеем Касцюковічам, ну і чамусці стаяла медсястра. Мяне гэта здзівіла трохі. Я падышоў і жонка сказала: "Бацькі ўжо няма".

Дома сталі вядомыя абставіны раптоўнае бацькавае смерці. Міхась Міцкевіч працягвае: "Ён у гэты дзень яшчэ ездзіў у Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі, як сказаў мой старэйшы брат Данік. Ён адвозіў пісьмо, якое ён доўга выношваў, доўга рыхтаваў. Гэтае пісьмо прысвечанае беларускай мове, яе значэнню, пашырэнню карыстання, там многа прыкладаў было. Ну, канечне, была аддадзеная і даніна сучаснасці, што тут поспехі і так далей, але тым не менш, мова занядбаная і прыходзіць у непарадак. Трэба прымаць меры. Ну, і мы спадзяваліся, што сапраўды будзе нейкая рэакцыя станоўчая, аднак гэтыя нашы спадзяванні былі марнымі».

*Радыё Свабода*

# ЧЫТАЧЫ ПЫТАЮЦЦА Ў «ЗВЯЗДЫ»:

**«Ці не плануецца перавесці на рускую мову выкладанне беларускай мовы і літаратуры?»**

Шквал званкоў абрушыўся на рэдакцыю: няўжо і праўда, што гісторыю Беларусі ў беларускіх школах будуць выкладаць па-руску? Гэтае пытанне я адрасавала начальніку аддзела выкладання грамадазнаўчых дысцыплін упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Надзеі ГАНУШЧАНКА.

*– Перш за ўсё я хацела б адзначыць, што ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам аб адукацыі і Законам аб мовах – грамадзянам нашай краіны гарантавана права выбару мовы навучання і выхавання. Гэта пазіцыя таксама замацавана ў новым Законе «Аб агульнай сярэдняй адукацыі», які прынятыя 5 ліпеня гэтага года. Вызначэнне статусу школ або класаў па мове навучання ажыццяўляецца па рашэнню мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, з улікам пажадання навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў.*

*Калі будуць падручнікі на рускай мове, то больш будуць ведаць пра Беларусь у свеце – пра яе складаную, цікавую гісторыю, сучаснае развіццё, культуру, навуку. У асобных краінах, на жаль, сёння яшчэ мала ведаюць пра Беларусь.*

– Калі нашы дзеці будуць вучыць гісторыю Беларусі па-руску, то ў свеце больш даведаюцца пра нашу краіну?..

*– Я кажу пра неабходнасць мець падручнікі на рускай мове. Тым больш, у нашы ВНУ паступаюць і абітурыенты з Расійскай Федэрацыі і іншых краін – мы зацікаўленыя ў тым, каб і яны ведалі нашу гісторыю.*

*У рамках Саюзнай дзяржавы мы праводзім алімпіяду для школьнікаў «Расія–Беларусь: гістарычная і духоўная еднасць». У ёй бяруць удзел вучні з усіх рэгіёнаў нашай рэспублікі і з многіх рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. А пытанні ў асноўным прысвечаны літаратуры і гісторыі. Беларускія вучні вывучаюць гісторыю Расіі, рускую літаратуру. А расійскія вучні не маюць дадат-ковай магчымасці знаёміцца з гісторыяй Беларусі, беларускай літаратурай, бо ў іх няма адпаведных дапаможнікаў.*

– Цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай мове здавала больш за 75 тысяч чалавек, па рускай – больш за 96 тысяч. Калі супаставіць лічбы: многія выпускнікі рускамоўных школ выбралі тэст па роднай мове. Гэта сведчыць пра тое, што яны ведаюць родную мову і хочуць, каб асяродак яе ўжывання пашыраўся.

*– Гэта так. А давайце паглядзім на ЦТ па гісторыі Беларусі. Яго праходзіла 31 600 абітурыентаў. 6455 чалавек здавала тэст на рускай мове. Гэта пры тым, што навучанне па прадмету вядзецца на беларускай мове. Мне здаецца, гэта даволі значная лічба ў дадзенай сітуацыі.*

*Да нас у міністэрства перыядычна паступалі звароты адносна таго, што мы не даём магчымасці вывучаць гісторыю Беларусі на рускай мове.*

– Чытачы просяць удакладніць: ці не плануецца перавесці на рускую мову таксама выкладанне беларускай мовы і літаратуры?

*– Ну, гэта пытанне, адчуваю, з разраду жартаў. Зразумела, у нашай краіне такога адбыцца не можа. Наогул, у 2001 годзе Міністэрствам адукацыі прынята праграма дадатковых мераў па пашырэнню выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі. Адпаведныя захады прымаюцца, у тым ліку і ў гарадской мясцовасці. Да 1 верасня гэтага года будзе выдадзена 175 найменняў падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для агульнаадукацыйных устаноў (тыраж – 6 063 497 экзэмпляраў), з іх 81 найменне – на беларускай мове (тыраж – 2 607 500 экзэмпляраў).*

– Дарэчы, а колькі беларускіх школ у Мінску?

*– У сталіцы 234 сярэднія агульнаадукацыйныя навучальныя ўстановы, з іх 4 беларускамоўныя гімназіі і 43 школы з дзвюма мовамі навучання.*

**Таццяна ПАДАЛЯК**

*Друкуецца ў скароце.*

# КУБІНСКАЯ ХВАРОБА

## Спадзевы на тое, што дыктатар Выспы Свабоды сканаў, не спраўдзіліся

**Кубінскія газеты надрукавалі свежыя фота Фідэля Кастра. У любым разе сыход тырана са сцэны не роўны вызваленню ад тыраніі. І гэта тычыцца не толькі Кубы.**

У гэтым годзе сярод дыктатараў існуе мода на часовыя таямнічыя знікненні. Так, больш месяца нічога не было чутна пра правадыра Паўночнай Карэі Кім Чэн Іра. Адразу пасля сакавіцкіх выбараў амаль два тыдні адсутнічаў у эфіры Аляксандр Лукашэнка. Аднак неўзабаве Лукашэнка ізноў з'явіўся на працоўным месцы. Знайшліся і Кім Чэн Ір, і Кастра...

... Мне пашчасціла патрапіць на Кубу гадоў дзесяць таму. Гэта надзвычай прыгожы край, нават у параўнанні з іншымі краінамі Цэнтральнай Амерыкі. І надзвычай бедны. Непрыхаваная галеча пануе нават у сталіцы: жахлівае відовішча напаўразбураных дамоў (жылых!) дагэтуль часам узнікае перад вачыма. Як і кубінскія прастытуткі, якіх на Кубе вельмі шмат. Ды іх і прастытуткамі не назавеш. Жабрацкае жыццё проста вымушае жанчын шукаць дадатковы заробак.



**Фідэль Кастра Рус.**
*Фота з архіва*

Гэта не дзіва: ніколі не чуў пра дыктатуру, якая б клапацілася пра народ на справе, а не на словах. Дзівіла іншае – АБЫЯКАВАСЦЬ кубінцаў. Здавалася, што іх ужо нішто не цікавіла, акрамя мясцовай "шкваркі ды чаркі". Сацыяльная палітыка Кастра будавалася па тых самых правілах, што і ягонага бацькі, буйнога землеўладара: работнік мусіць быць здаровы і не паміраць ад голаду. Ці дакладней так: РАБ мусіць быць здаровы і не паміраць ад голаду. Бо калі раб хворы ці зусім знясілеў, які ж з яго работнік?

Паводле сённяшніх паведамленняў, падчас хваробы Кастра ў кубінскім грамадстве нічога не змянілася. Усё тая ж абыякавасць: жывы Фідэль ці памёр, насамрэч, мала каго хвалявала. За часы тыраніі народ ператварыўся ў статак, які ўжо не чакае аніякіх пераменаў, ні на што не спадзяецца і не імкнецца да лепшага жыцця.

Вірус "кубінскай хваробы" паступова распаўсюджваецца і ў нашых краёх. Да Лукашэнкі паступова прыстасоўваецца шмат хто з тых, хто раней яго абсалютна не ўспрымаў. Больш за тое, людзі пачынаюць шукаць довады на карысць цяперашняга кіраўніка — найперш, каб апраўдаць уласную пазіцыю.

Беларускае грамадства нагадвае пупыр, з якога выпусцілі паветра. Яго яшчэ можна надзьмуць, і тады ён будзе прыгожа лётаць і цешыць вока. Але ж... "Не ў гэтым жыцці", — сумна жартуюць (ці не жартуюць) людзі. Ужо дванаццаць гадоў, як змрок робіцца ўсё гусцейшы, і кожнаму на асабістым узроўні патрэбна шмат мужнасці і волі, каб не растаць ў гэтай цемры, якая ўжо паглынула і далучыла да сябе тысячы суайчыннікаў.

Дзякуй Богу, пры ўсім тым у нас далёка не Куба, і спадзяюся, да такога жахлівага ва ўсіх сэнсах стану мы не дойдзем. Аднак будучыня Беларусі залежыць ад таго, колькі людзей сёння не скарыцца і захавае здольнасць да змагання за лепшую долю. Натуральна, не варта разлічваць, што такіх будзе большасць. Ды й не трэба: у вырашальныя моманты большасць амаль заўсёды падпарадкоўваецца актыўнай меншасці. Але патрэбна, каб меншасць усё-ткі была не мізэрнай, а заўважнай; каб яна магла выконваць ролю паравоза, што ўпарта цягне груваcткія вагоны са змрочнага тунэля на святло.

Рабам жа сапраўды не выпадае іншай долі. На іх заўсёды знойдзецца бізун – ці старога гаспадара, ці новага. На Кубе пераемнікам дыктатара прызначаны ягоны брат. І як гавораць некаторыя эксперты, "калі вы лічыце Фідэля Кастра дрэнным хлопцам, пачакайце, пакуль не пазнаёміцеся з Раўлем".

**Валер ФІЛІН**

# ПАМЫЛКА ГЛОБЫ

## Паводле астролага, Лукашэнка павінен быць жанчынай

Вядомы астролаг Павел Глоба чарговы раз уразіў свет сваёй творчасцю. Дзякуючы яго прадказанню, чалавецтву цяпер вядома імя месіі, закліканага аб'яднаць усе славянскія народы.

— Нягледзячы на тое, што па ўсім свеце з яго з дапамогай «чорнага піяру» робяць не самага лепшага кіраўніка, Лукашэнка адыграе сваю станоўчую ролю ў будучым аб'яднанні цывілізацыі славянскіх народаў, — заявіў Павел Глоба ў інтэрвію тыднёвіку «Обозреватель».

Дзеля большай пераканальнасці Глоба дадаў, што «Беларусь з'яўляецца цэнтрам Еўропы, яна трымае своеасаблівую ось раўнавагі ва ўсёй еўрапейскай сістэме».

Прадказваць кіраўніку Беларусі доўгія гады жыцця зрабілася ўлюбёным заняткам навяўленага Настрадамуса. Праўда, з кожным разам тэрмін паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы даводзіцца падаўжаць — не ўпісваецца неяк беларуская Канстытуцыя ў карту зорнага неба. Прыканцы 1990-х гадоў Глоба заяўляў, што Лукашэнка будзе прэзідэнтам дванаццаць гадоў. Але згодна с апошнім назіраннем за зоркамі, будзе Аляксандр Лукашэнка «гнуць сваю лінію, пакуль жыве».

А што тычыцца абяцаных дванаццаці гадоў — ну, памыліўся, з кім не здараецца? Гэта яшчэ што! У сярэдзіне 1990-х памылка Глобы каштавала беларускаму прэзідэнту...пола. Яшчэ да прыходу Лукашэнкі да ўлады астролаг заявіў, што прэзідэнтам Беларусі будзе жанчына! Ёсць і больш свежыя прадказанні. Незадоўга да прызначэння выбараў Павел Глоба заявіў, што ведае, хто стане прэзідэнтам Беларусі ў 2006 годзе. «У вырашальнай барацьбе, якая будзе вельмі напружанай, сыйдуцца два Аляксандры і пераможа мудрэйшы. Моладзь у майках і шортах будзе стаяць на плошчах і спяваць песні...Шмат тэхнікі розная будзе ў горадзе, а людзей не будзе на працы. Тэлебачанне змоўкне. Шмат падзей будзе розных і нечаканых, шмат здрадніцтва, але пераможа розум».

Паспрабуем разабрацца. Насамрэч, Аляксандраў было тры, але прадказальнік не змог прадбачыць, што абраны на Кангрэсе дэмакратычных сіл Мілінкевіч так і не зможа дамовіцца з партыяй Казуліна? Не ведаў Глоба і аб тым, што выбары, запланаваныя на лета, перанясуць на самы пачатак вясны — зоркі, выглядае, тады яшчэ не былі ў курсе планаў беларускага прэзідэнта, ці проста баяліся распавесці пра іх. Што тычыцца шортаў, а таксама сонца, якога «будзе шмат над плошчамі», — думаецца, многія яшчэ не забыліся на тую завіруху са штучнага снегу, які скідвалі на галовы мітынгоўцаў.



**АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА.**
*Фота з архіва*

Ну, каб прадказаць, што ў дзень выбараў людзі не пойдуць на працу, а тэхнікі будзе ў горадзе шмат, для гэтага не трэба быць вялікім астролагам. Што ж тычыцца фразы «тэлебачанне змоўкне», дык калі размова ідзе пра БТ, то аб гэтым шмат хто марыў. Не спраўдзілася.

Ну, і апошняе: «пераможа розум» — пакінем, бадай, гэтае выказванне без камэнтароў.

**Паводле www.gazetaby.com**
*Друкуецца ў скароце.*

# НАША ЧАРГА

## ЦІ НЕ НАШ ЧАС ПРЫЙШОЎ ТВАРЫЦЬ ГІСТОРЫЮ?

Кожны нармальны чалавек позна ці рана павінен зацікавіцца сваім радаводам. У адных гэта бывае яшчэ ў дзяцінстве, калі малое чапляецца да бацькоў з пытаннямі тыпу: "А хто быў мой прадзед?", "А прабаба?", "А іхныя бацькі?" Іншыя пачынаюць цікавіцца пазней, калі пакутліва шукаюць сэнсу жыцця і свайго, вызначанага лёсам, месца пад сонцам. Нехта пачынае думаць пра радавод у гады, калі прыйшоў час адказваць сваім малым на згаданыя пытанні. А нехта носіць у сабе тыя-ж пытанні да сталага веку й разраджаецца імі ў часе, калі запытацца адказу няма ў каго.

Я цікавіўся сваім радаводам заўсёды. Пра некаторых продкаў ведаю больш, пра некаторых – нічога. Часам, толькі імя. Часам – аповяды, часам смешныя, а часам амаль казачныя выпадкі.

Цяжка сказаць праўда тое ці не, але адзін мой зродны брат меў нагоду пакорпацца ў санкт-пецярбургскіх архівах. Я сустрэўся з ім у Празе, куды яны з жонкай завіталі пасля іртовага адпачынку ў чэскіх Карканошах. Узяўшы па трэцім, калі не шостым, келіху віна, ён распавёў мне пра плён сваіх пошукаў. Я верыў у ягоныя словы, пакуль у аповедзе не пачалі з'яўляцца гістарычна вядомыя асобы.

Па-першае, пра такіх продкаў у сем'ях звычайна ведаюць. Вось быў-жа ў майго няроднага дзядзькі далёкі крэўны, які ў 30-я гады мінулага стагоддзя прыходзіў да яго пазычаць атраманту для асадкі. Што ён тым атраманта пісаў – не ведаю, а толькі па сканчэнні школы пакінуў родную Лепельшчыну, даўнырца ў жыццёвыя плыні ды праз які дзесятак гадоў вынырнуў ажно ў Маскве, ды яшчэ на неабыякой пасадзе ў ЦК кампартыі СССР. Пазычанага атраманту дзядзьку не вярнуў. На Лепельшчыну забыўся. Але ж, мы яго памяталі.

Па-другое, прынагодна вывучаючы свой радавод, я ні на што падобнае не натыркаўся, хаця ведаю продкаў шмат лепш ад брата.

Ну а па-трэйцяе, гаварыць гэты брат умее доўга й складна, і словы тыпу памылка ці недакладнасць, у дачыненні сябе, яму невядомыя.

Гэткім чынам, па-мойму, ані Сокалавы, ані Воюшы з Лепельшчыны ніяк сябе ў мінулым не паказалі, нічога гістарычна-значнага не зрабілі, хаця былі сярод іх і майстры, і ваяры, і гандляры. А найбольш: звычайны сялянскі род, калі не лічыць бабулі па мячы, якая паходзіла з адукаванай шляхты. Мой дзед, Генадзь Сокалаў, недзе ў 1918 годзе скраў яе ў бацькоў, што ў тым часе бязбедна атабарыліся ў Маскве, прывёз у вёску Сакалы, што пад Лепелем, і пайшоў на вайну.

І ўсё-ж, натрапляючы на розныя імянныя паказальнікі ў кніжках ці Інтэрнэце, я заўсёды шукаю ў іх добры дзесятак прозвішчаў свайго роду або радзінаў сваіх найлепшых сяброў. Часам шанцуе. Аднойчы знайшоў прозвішчы продкаў адной маёй знаёмай як па мячы, так і па кудзелі. Выявілася, што жылі яны ў той самай вёсцы ажно з XVII стагоддзя. Перыядычна трапляецца досыць рэдкае прозвішча аднаго сябра, пра што я яму заўсёды паведамляю. Ёсць пара-другая сяброў, чые прозвішчы не трапіліся ніколі. Тое-ж і з маімі. Відаць, жылі і не вытыркаліся, нікуды асабліва не лезлі. І чым больш я пераконваюся ў слушнасці гэтай думкі, тым часцей у мяне ўзнікае пачуццё віны перад сваім народам, перад тымі ягонымі прадстаўнікамі, што ўславілі нашую зямлю мірна або збройна, перад тымі, што не пабаяліся пакінуць свае імёны ў гісторыі й перадаць іх нашчадкам.

Усё напісанае вышэй спала мне на думку перад прэзідэнцкімі выбарамі, калі ў шэрагах кандыдатаў з'явіўся Аляксандар Мілінкевіч – прапраўнук і праўнук паўстанцаў Каліноўскага, унук заходне-беларускага змагара за нацыянальную школу. Стаць побач з чалавекам за чыёй спінай такі радавод – ганарова, як не менш ганарова стаць і побач з Зянонам Пазняком, у якога радавод таксама не шараговы. Таму мяне здзівіла пазіцыя некаторых нашых вядомых дзеячоў, што апынуліся ў іншых камандах. Захапляючыся каліноўцамі, услаўляючы іх, яны, у той самы час, становяцца ў апазіцыю да іхных нашчадкаў. Дзе лёгіка? А можа ў іхных радаводах спрэс Скарыны, Сапегі ды Касцюшкі? Можа іхныя продкі не так, як мае? Можа яны цяжкімі часінамі не хаваліся пад саламянымі стрэхамі ды ў ваўчыных ямах, а стаялі пад Грунвальдам ці гадамі трымалі аточаны расейцамі Стары Быхаў і тое засведчана дакументальна, або ў сямейных паданнях?.. Не выглядае…

І вось я думаю: а ці не наш час прыйшоў тварыць гісторыю ды перамагаць у імя Айчыны? Ці не нашая чарга сплочваць пазыку перад уласным народам і памяццю тых вядомых ці проста помных, хто ўславілі яго ў мінуўшчыне?

З болем і захапленнем увесь апошні месяц вывучаў весткі з Радзімы. Колькі новых імёнаў, новых герояў! Колькі змагароў за Беларусь! Усе гэтыя людзі ўжо ўвайшлі ў гісторыю, усе далі сваім нашчадкам той падмурак з мінулага, на якім можна цвёрда стаяць, будуючы сваю краіну. Нават калі нехта з іх не здолее перадаць свой жыццёвы досвед наступнікам, за яго гэта зробяць сябры, аднадумцы, родныя, за яго гэта зробяць шматлікія публікацыі ў незалежных выданнях рознага кшталту. І мы больш ніколі не будзем мець безыменных герояў. Мы больш ніколі не будзем мець вартых, але забытых, або пакінутых па-за ўвагай гісторыі.

Вядома, у апраўданне сваёй бяздзейнасці сёй-той можа прывесці безліч важкіх аргумэнтаў. Сёй-той можа спаслацца на засведчанасць свайго ймя ў гісторыі, як гэта мог-бы зрабіць я, чые продкі далі назву аднаму з населеных пунктаў Беларусі – згаданай ужо вёсцы Сакалы… І, напэўна, некаму таго было б досыць. Вось толькі вёска Сакалы ўжо з паўстагоддзя як не жыве. Яна загінула па Другой Сусветнай, здолеўшы перажыць уладу фашыстоўцаў, але не перажыўшы вясковай палітыкі "самай народнай, самай прагрэсіўнай у свеце" саветчыны. Гэта значыць, што ніякі подзвіг тваіх продкаў не гарантаваны ад забыцця, калі нашчадкі не пярэймуць самога духу зробленага, не памножаць яго сваёй дзейнасцю і не перададуць працяг справы ў рукі наступнікаў.

"Край вялікіх і дум, і людзей," – з моцным захапленнем ад старых часоў і адначасна з глыбокім сумам над сучаснасцю, ды з вялікім авансам нашчадкам назваў некалі Беларусь паэт і ваяр БНР Уладзімер Жылка. Паэтычнае пачуццё падказвае мне, што меў ён на ўвазе і нас – тых, чый радавод толькі пачынаецца на вуліцах і плошчах сённяшняй змагарнай Беларусі, тых, хто сёння выгукае з-за кратаў: "Жыве Беларусь!" і ў адказ чуе не рэха вастрожных калідораў, а тысячы жывых галасоў з вуліцы: "Жыве!"

Сержук Сокалаў-Воюш,
2 красавіка 2006 г.

*Эсэ ў амерыканскай газеце «Беларус» №519. Друкуецца з невялікімі скарачэннямі.*

**belarus.org**

# Фатафакт



**Гандаль мёдам падчас святкавання Спасу.** Мінск, 13 жніўня 2006 году.

*Спас — старажытнае свята земляробчага календара, прымеркаванае да часу выспявання садавіны, гародніны. З'яўляўся мяжой паміж летнім і асеннім цыкламі работ. У асобных мясцовасцях, у залежнасці ад прыродных умоў, са Спаса пачыналі сяўбу азімых, капалі раннюю бульбу, падглядвалі пчол. Падгляд пчол меў характар сталага звычаю. Паводле народнага календара, са Спаса пачыналася ранняе бабіна лета ("Прыйшоў Спас — і лета ад нас"). Раней на Спаса наладжваліся кірмашы, на якіх прадавалі садавіну, гародніну, мёд. На Беларусі найбольш пашыраны быў другі Спас — так званы яблычны (святкаваўся 6 жніўня па старому стылю). Лічылася, што да Спаса нельга было есці яблыкі. Царква прымеркавала да яго свята "ператварэння Хрыста", надала народным рытуалам рэлігійнае значэнне (асвячэнне пладоў, насення). Рэшткі старажытнага свята выяўляліся ў імкненні ласавацца ў гэты дзень садавінай ("Прыйшоў Спас — на ўсё час"). У жніўні святкаваліся таксама менш значныя першы (мядовы) і трэці Спас.*

mybelarusia.com

# Дні

**18 жніўня** 1941 году ў мястэчку Зэмбін Барысаўскага раёну фашысты расстралялі каля тысячы мясцовых жыхароў-габрэяў. Пасля гэтага габрэйскае жыццё ў Зэмбіне ўжо не адрадзілася. Між тым, яшчэ да рэвалюцыі гэтае мястэчка было шырока вядомае. Тут ствараліся хаўрусныя банчкі - крэдытныя таварыствы, пра якія пісала віленская "Наша Ніва".

**19 жніўня** 1995 году пачаўся страйк мінскага метрапалітэну. Работнікі пратэставалі супраць парушэння дырэкцыяй працоўнага заканадаўства і супраць затрымкі заробкаў. Улада жорстка расправілася з рабочымі. 68 чалавек былі звольненыя. На цягніках метро іх замянілі пакліканыя з Масквы штрэйкбрэхеры.

**20 жніўня** 1919 году памёр Іван Луцкевіч. Каб уявіць маштаб страты, дастаткова сказаць, што Луцкевіч быў абсалютным аўтарытэтам у нацыянальным адраджэнні нашаніўскай пары. Менавіта з яго ініцыятывы паўставала Беларусь ва ўсіх яе праявах - у культуры, палітыцы, эканоміцы. Луцкевіч далучыў да сваіх ініцыятыў сотні людзей, імёны якіх сёння з'яўляюцца прадметам нацыянальнага гонару.

**21 жніўня** 1968 году пачалася інтэрвенцыя войскаў Варшаўскага пакту на чале з СССР у Чэхаславаччыну. Такім чынам працэс дэмакратычнага абнаўлення краіны, названы «Праскай вясной», быў спынены.

**22 жніўня** Расія святкуе Дзень сцяга. У гэты дзень 1991 году быў адноўлены ў якасці дзяржаўнага гістарычны расійскі трыкалёр. Згадаем, што ў Беларусі гістарычны дзяржаўны бел-чырвона-белы сцяг быў адменены А.Лукашэнкам у 1995 годзе. З таго моманту ён стаў сцягам патрыятычных сіл краіны.

На **23 жніўня** 1430 году была прызначана каранацыя вялікага князя Вітаўта. Такім чынам другі сярэднявечны кіраўнік беларускіх земляў мусіў стаць каралём. Першым амаль 200 гадоў дагэтуль у Навагрудку быў каранаваны Міндоўг. І вось цяпер у Троцкім замку чакалі асвячонае папам рымскім кароны, якую вёз пасол Сенька Гедыголдавіч. Лічыцца, што на польскай мяжы карону адабралі палякі. Нібыта загад на тое даў раўнівы стрыечны брат Вітаўта польскі кароль Ягайла. Так ці інакш, а праз месяц пасля няўдалае каранацыі Вітаўт памёр.

# ЗАЭКРАННЫХ СПРАЎ МАЙСТРЫ

## БТ ЗГАТАВАЛА МІЖНАРОДНЫ КАНФЛІКТ

**Паводле Міністэрства замежных спраў Латвіі, кадры скандальнай відэастужкі з удзелам латвійскага дыпламата Рэйма Шмітса, паказаныя 30 ліпеня ў эфіры дзяржаўнага тэлебачання Беларусі, з'яўляюцца фальшывымі.**

«Мы лічым, што відэа было сфабрыкавана», — заявіў у інтэрвью латвійскай газеце «Телеграф» дзяржсакратар МЗС Латвіі Норман Пенке.

Ён паведаміў, што афіцыйныя тлумачэнні, дадзеныя беларускім бокам у сваёй ноце 4 жніўня, латвійскі МЗС лічыць надта фармальнымі і недастатковымі.

25 ліпеня ў Мінску ў кватэры Шмітса быў праведзеныператрус, пасля якога афіцыйныя прадстаўнікіі беларускага МУС заявілі аб тым, што латвійскі дыпламат нібыта распаўсюджваў парнаграфію. Падчасператрусу ў Шмітса былі канфіскаваныя відэакасеты.

30 ліпеня дзяржаўнае тэлебачанне Беларусі прадэманстравала кадры гомасексуальнага полавага акта з удзелам Рэйма Шмітса. Тэлерэпартаж выніковай інфармацыйнай праграмы быў прысвечаны абвінавачанню латвійскага дыпламата ў распаўсюдзе парнаграфіі.

Пасля гэтага паміж Латвіяй і Беларуссю ўспыхнуў дыпламатычны скандал, вынікам якога стаў абмен нотамі і выдаленне з Латвіі першага сакратара пасольства Беларусі ў Рызе Дзмітрыя Краюшкіна.

Міністр замежных спраў Латвіі Пабрыкс адмаўляецца сустрэцца з нядаўна прызначаным паслом Беларусі ў Рызе Герасіменкам да таго часу, пакуль беларускі бок не дасць вычарпальных тлумачэнняў наконт парушэння Венскай канвенцыі аб недатыкальнасці дыпламатаў. Парушэнне Венскай кавенцыі ўладамі Беларусі асудзілі таксама кіраўніцтва Еўрасаюза і ўрад ЗША.

*Паводле латвійскай газеты «Телеграф»*




**«Калі яны будуць працягваць, дык і мы будзем працягваць.»** *З інтэрвью А. Зімоўскага «БелГазете» №31 (550) за 7 жніўня 2006 году. Інтэрвью надрукавана пад назвай «Ну, далі трохі перцу».*
Калаж **www.belzhaba.com**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер"
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Мінск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Падпісана ў друк** 17.08.06
**Тыраж** 299 экзэмпляраў
**Распаўсюджваецца** бясплатна.